*А.В. Шарапава, В.І. Караткевіч* (Магілёў)

# АСЭНСАВАННЕ ТЭАРЭТЫЧНЫХ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ПАНЯЦЦЯЎ У КАНТЭКСЦЕ ЗАДАЧ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 25 ліпеня 2011 г., прадугледжваецца *«<...> пераемнасць і непарыўнасць ступеняў адукацыі у межах дашкольнай адукацыі, а таксама з 1 ступенню агульнай сярэдняй адукацыі»*. Такі падыход забяспечвае сістэмнасць пры асэнсаванні многіх складаных пытанняў па розных напрамках развіцця выхаванца (фізічным, сацыяльна-маральным і асобасным, пазнавальным, маўленчым, мастацка-эстэтычным), што прадстаўлены асобнымі адукацыйнымі галінамі і кампанентамі. Напрыклад, мастацка-эстэтычнае развіццё – мастацтва – мастацкая літаратура (успрыняцце, выразнае чытанне, расказванне, драматызацыя). На кожным з этапаў свайго развіцця выхаванцы асэнсоўваюць літаратурна-мастацкі твор і знаёмяцца з пэўнымі тэарэтычнымі паняццямі. Нават у дзяцей групы першага ранняга ўзросту – да 1 года – неабходна стымуляваць эмацыйную чуласць, што з'яўляецца пачатковым этапам усведамлення такога паняцця, як пафас. Назіранні за этапамі ўспрыняцця і асэнсавання тэарэтычных літаратуразнаўчых паняццяў прадстаўлены ў табліцы:

| УЗРОСТ | ЗМЕСТ МАСТАЦКАГА ТВОРА | ФОРМА МАСТАЦКАГА ТВОРА | ЖАНР МАСТАЦКАГА ТВОРА |
|---|---|---|---|
| Да 1 года (група першага ранняга ўзросту) | Стымуляванне эмацыйнай чуласці, што з'яўляецца пачатковым этапам усведамлення такога паняцця, як пафас мастацкага твора (МТ). | | |
| Ад 1 года да 2 гадоў (група другога ранняга ўзросту) | Наступны этап усведамлення пафасу. Пачатковы этап асэнсавання тэмы і ідэі МТ. | | Фарміраванне першапачатковага ўяўлення дзіцяці пра жанравую прыналежнасць МТ (казка, апавяданне, малыя фальклорныя жанры). |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| УЗРОСТ | ЗМЕСТ МАСТАЦКАГА ТВОРА | ФОРМА МАСТАЦКАГА ТВОРА | ЖАНР МАСТАЦКАГА ТВОРА |
|---|---|---|---|
| Ад 2 да 3 гадоў (першая малодшая група) | Фарміраванне паняцця «фабула» як падзейнай асновы твора пры далучэнні да пераказу МТ. | Фарміраванне сістэмы ведаў пра сродкі мастацкай выразнасці, у прыватнасці, пра стылістычныя фігуры паўтору (алітэрацыя і асананс). | Першапачатковае уяўленне пра казку фальклорную і літаратурную (апошняя мае канкрэтнага аўтара, прозвішча якога называецца). |
| Ад 3 да 4 гадоў (другая малодшая група) | Фарміраванне здольнасці не толькі самому ўсведамляць эмацыйны настрой, але і ўплываць на пачуцці рэцыпіентаў, напрыклад, пры драматызацыі МТ. | Першапачатковае уяўленне пра мастацкі вобраз. Фарміраванне паняцця «сюжэт». Навучанне навыкам успрыняцця некаторых элементаў мастацкай формы: рыфмы, рытму, што вучыць адрозніваць вершаванае і празаічнае маўленне. | Фарміраванне пачатковых навыкаў характарыстыкі жанравай формы праз вылучэнне найбольш паказальных яе асаблівасцяў (казка – наяўнасць паўтораў, магія лічбаў і інш.). |
| Ад 4 да 5 гадоў (сярэдняя група) | Развіццё ўмення разумець тэму і ідэю МТ, фарміраванне ўмення патлумачыць сваю пазіцыю пры характарыстыцы мастацкага твора. Развіццё здольнасцях выхаванца вызначыць на першасным узроўні пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял МТ. | Развіццё здольнасці разумення паняцця «мастацкі вобраз». Уменне даваць яго характарыстыку. Фарміраванне навыкаў самастойна развіваць сюжэт МТ з улікам вядомых сюжэтных схем, [illegible] структуры аповеду (зачын, канцоўка). Фарміраванне паняцця пра кампазіцыю. | Вылучэнне некаторых устойлівых асаблівасцяў «малых» фальклорных і літаратурных жанраў. Спроба самастойнага мадэлявання пэўных жанравых утварэнняў. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| УЗРОСТ | ЗМЕСТ МАСТАЦКАГА ТВОРА | ФОРМА МАСТАЦКАГА ТВОРА | ЖАНР МАСТАЦКАГА ТВОРА |
|---|---|---|---|
| Ад 4 да 5 гадоў (сярэдняя група) | Фарміраванне ў дзяцей навыкаў адрознення розных праяў камічнага (гумарыстычнага і сатырычнага), што з'яўляецца далейшым паглыбленнем паняцця пафас. | Усведамленне адрозненняў прозы і паэзіі (з улікам мнематычнай функцыі апошняй). Фарміраванне сістэмы ведаў пра сродкі мастацкай выразнасці (эпітэты, параўнанні, метафары і інш.), уменне знаходзіць іх у тэксце, выкарыстоўваць у штодзённых зносінах. | |
| Ад 5 да 6 гадоў (старшая група) | Азнаямленне з паняццем тэматычнай разнастайнасці мастацкай літаратуры. Уменне вылучыць паказальныя асаблівасці літаратурнага характару і спраецыраваць яго на вядомых для выхаванца асоб. | Развіццё уяўленняў пра сродкі мастацкай выразнасці і іх дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад вершаванага і празаічнага маўлення. Пры аналізе вершаваных твораў фарміраванне і удакладненне паняццяў рыфма, гукапіс, строфіка, інтанацыйна-рытмічны лад, стылістычныя прыёмы і тропы. Стымуляванне выхаванцаў да складання уласных твораў. | Абагульненне атрыманых і набыццё новых ведаў пра фальклорныя і літаратурныя жанры. Фарміраванне уменняў перадаваць асаблівасці пры чытанні на памяць або пераказе (казка – фарміраванне сітуацыі расказвання, верш, байка – фарміраванне здольнасцяў да інтаніравання, тэатралізацыі і інш.). |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Канчатак табліцы*

| УЗРОСТ | ЗМЕСТ МАСТАЦКАГА ТВОРА | ФОРМА МАСТАЦКАГА ТВОРА | ЖАНР МАСТАЦКАГА ТВОРА |
|---|---|---|---|
| Ад 6 да 7 гадоў (старшая група) | Выхаванцы гэтага ўзросту часцей за ўсё пападаюць у першую старшую групу (ад 5 да 6 гадоў), дзе у асноўным паўтараюцца і паглыбляюцца ўжо набытыя веды. Таму у адносінах да такіх дзяцей выхавацелю, бацькам трэба імкнуцца стварыць умовы для стымулявання і актывізацыі пры ўспрыняцці, расказванні ці нават чытанні, а таксама драматызацыі МТ. | | |

Такім чынам, неабходна адзначыць, што сістэма першасных тэарэтычных літаратуразнаўчых паняццяў паступова фарміруецца ўжо на этапе дашкольнай адукацыі, дае магчымасць падрыхтаваць выхаванца да ўспрыняцця як мастацкага, так і любога тэксту, дзякуючы ў пэўнай ступені сфарміраваным уменням вызначыць элементы структуры тэксту, вылучыць галоўнае і другаснае, знайсці ў ім пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял. Падобныя ўменні і навыкі паказальна будуць рэалізоўваць асноўную мэту дашкольнай адукацыі – рознабаковае развіццё і сацыялізацыю выхаванца, а таксама дадуць магчымасць лепшай адаптацыі дзіцяці ў школе.

онный архив библиотеки МГУ имени А. А. Ку